# РЭГІЯНАЛЬНЫ ДРУК БЕЛАРУСІ Ў 1930-Я ГГ.

***М. В. Прахарэня***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*prakhar@bsu.by*

У матэрыяле даследаваны гістарычны вопыт развіцця рэгіянальных СМІ. Адлюстраваны працэс станаўлення раённых і абласных газет у 1930-я гг. Апісваюцца функцыянальнае прызначэнне і характэрныя рысы рэгіянальнага друку БССР, які ў 1930-я гг. стаў масавым.

***Ключавыя словы:*** рэгіянальны друк; рэгіянальныя СМІ; раённыя газеты; абласныя газеты; БССР.

# THE REGIONAL PRESS OF BELARUS IN THE 1930S

***M. V. Prakharenya***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvaryjskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: M. V. Prakharenya (prakhar@bsu.by)*

The material describes the historical experience of the development of regional mass media. The process of formation of district and regional newspapers in the 1930s is studied. Describes the functional purpose and characteristic features of regional press of BSSR, which in the 1930s became popular.

***Key words:*** regional press; regional media; district newspapers; regional newspapers; BSSR.

Непасрэдны ўплыў на фарміраванне сістэмы рэгіянальнага друку Беларусі аказалі адміністрацыйна-тэрытарыяльныя пераўтварэнні. Так, у канцы 20-х – пачатку 30-х гг. XX ст. савецкая ўлада працягвала пошук найбольш аптымальнага ў эканамічным плане варыянту адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання БССР.

З мэтай спрашчэння сістэмы кіравання, прамога падпарадкавання цэнтру мясцовых органаў улады неабходна было рэгулярна праводзіць

рэарганізацыю некаторых тэрытарыяльных адзінак. У ліпені 1930 г. ЦВК і СНК БССР быў падпісаны рэспубліканскі акт «Аб ліквідацыі акруг». У сувязі з гэтым была спынена дзейнасць акруговых газет. Перыяд функцыянавання сістэмы акруговай прэсы (1924–1930 гг.) стаў важным этапам у працэсе станаўлення сістэмы беларускай рэгіянальнай перыёдыкі, падчас якога былі выпрацаваны асноўныя напрамкі яе работы. Нягледзячы на непрацяглы час існавання, гэтыя выданні заваявалі аўтарытэт у масавага чытача, і, адлюстроўваючы новую рэчаіснасць, садзейнічалі ўмацаванню палітычнага курса маладой савецкай дзяржавы.

Назапашаны вопыт акруговых газет быў творча выкарыстаны раённымі выданнямі, паколькі новая сістэма адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу прадугледжвала скасаванне акруг з захаваннем існуючых раёнаў і сельсаветаў у ранейшых межах. Дзейнасць раённай прэсы была рэгламентавана Пастановай ЦВК УКП(б) «Аб рэарганізацыі сеткі газет у сувязі з ліквідацыяй акруг». Паступова раённыя выданні сталі не толькі самым масавым сегментам друкаваных СМІ, але і неад’емнай часткай сацыяльна-палітычнага жыцця ў рэгіёнах.

У перыяд 1930–1931 гг. у БССР была арганізавана дзейнасць першых 32 раённых газет. Камітэт па справах друку пры СНК БССР пры іх арганізацыі і афармленні раіў кіравацца наступнымі крытэрыямі: стартавы капітал раённай газеты рэкамендавалася ўстанавіць у памеры 2 тыс. руб.; штат раённага газетнага выдавецтва павінен быць пабудаваны ў кожным раёне, зыходзячы з мясцовых умоў, прычым колькасць адзінак і стаўка заработнай платы зацвярджаліся мясцовымі органамі ўлады; для газет, якія будуць выходзіць 1–2 разы ў дэкаду, устанаўліваўся штат з 4 супрацоўнікаў, 3–4 разы ў дэкаду – 7; штодзённа – 10; усе раённыя газеты павінны былі друкавацца ў стандартным фармаце 4 паласы (па тыпу рэспубліканскай газеты «Рабочий»); раённым газетам неабходна было мець ярка выяўлены вытворчы характар і шырока асвятляць мясцовае жыццё, развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці, культуры [1, арк. 100–101].

У першую чаргу, планавалася арганізаваць выданне газет у тых раёнах, дзе ёсць паліграфічная база. Так, у Барысаве друкаваліся бягомельская, капыльская, плешчаніцкая, чырвонаслабодская, слуцкая раённыя газеты, у Оршы – лепельская, аршанская і дубровенская [2, с. 32].

Пры вызначэнні перыядычнасці выхаду і тыражу газет улічвалася колькасць насельніцтва, сельсаветаў і гаспадарак на тэрыторыі раёна.

Так, газеты найбольш буйных Гомельскага і Віцебскага раёнаў павінны былі выдавацца штодзённа, Магілёўскага, Бабруйскага і Полацкага – раз на 3-4 дні. Астатнія выходзілі ад 3 да 9 разоў у месяц.

Паступова колькасць раённых выданняў павялічвалася: у 1931 г. іх было 32, у 1932 г. – 75 [1, арк. 101], у 1938 г. – 92 [3, с. 236].

Штогод у сістэме адміністрацыйнага падзелу БССР адбываліся змены. Так, летам 1935 г. была часткова адноўлена акруговая сістэма. На тэрыторыі БССР зноў было ўтворана 4 акругі – Мазырская, Слуцкая, Лепельская, Палеская. Гэта было звязана з неабходнасцю забеспячэння больш аператыўнага кіраўніцтва на месцах у сувязі з умацаваннем савецкай мяжы з Польшчай і пашырэння паўнамоцтваў мясцовай улады. Адпаведна, аднавілі дзейнасць наступныя акруговыя выданні: «Праўда на рубяжы» (Слуцкая акруга), «Бальшавік Палесся» (Мазырская акруга), «Бальшавік Полаччыны» (Полацкая акруга), «Калгасная праўда» (Лепельская акруга). У 1938 г. акругі былі зноў ліквідаваны. Выданням Слуцкай, Полацкай, Лепельскай акруг вярнулі статус раённых.

У канцы 30-х гг. XX ст. у савецкай краіне сталі звяртацца да пытання аб стварэнні прамежкавага звяна паміж цэнтрам і раёнамі – вобласці. Так, у студзені 1938 г. у БССР было ўтворана 5 абласцей: Віцебская, Гомельская, Магілёўская, Мінская і Палеская. Пасля адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы была арганізавана дзейнасць новага віду рэгіянальнай перыёдыкі – абласных газет – з той жа мэтай інфармавання насельніцтва і асвятлення мясцовых падзей. Як правіла, яны ствараліся на базе ўжо існуючых раённых. Так, першыя абласныя газеты выйшлі ў Гомельскай вобласці («Гомельская праўда»), Магілёўскай («Магілёўская праўда»), Віцебскай («Віцебскі рабочы»). Папярэдніцай газеты «Савецкае Палессе» (Палеская вобласць) стала выданне адноўленай у 1935 г. Мазырскай акругі «Бальшавік Палесся».

У лістападзе 1939 г. пасля далучэння да БССР Заходняй Беларусі былі ўтвораны Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская і Пінская вобласці. У выніку з’явілася 5 новых абласных і 18 раённых выданняў. Раённыя газеты на тэрыторыі Заходняй Беларусі выходзілі з перыядычнасцю 2 разы на тыдзень. Іх тыраж вагаўся ад 1,5 да 2 тыс. экз. [4, арк. 70].

Такім чынам, фарміраванне сістэмы рэгіянальнага друку Беларусі абумоўлена адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі трансфармацыямі, якія пачаліся ў 20-я гг. XX ст. Першы этап у станаўленні сістэмы рэгіянальных СМІ звязаны з дзейнасцю акруговых газет, якія функцыянавалі ў БССР

у 1924–1930 гг. У 1930-я гг. вопыт акруговых выданняў быў выкарыстаны раённым і абласным друкам. У гэты час былі створаны рэгіянальныя выданні, значная частка з якіх функцыянуе і сёння. Пераадолеўшы тэхнічна-фінансавыя і кадравыя цяжкасці, гэты сегмент прэсы змог цалкам задаволіць інфармацыйны попыт на месцах.

Пад уплывам важных сацыяльна-эканамічных і палітычных падзей з 1930-х гг. рэгіянальны друк БССР становіцца масавым. На дадзеным этапе пачалі вызначацца напрамкі дзейнасці рэгіянальнага друку, задачы якога былі сфармуляваны наступным чынам: служыць эфектыўным інструментам кансалідацыі грамадства, спрыяць сацыяльна-эканамічнаму дабрабыту насельніцтва, абараняць інтарэсы грамадзян, дапамагаць грамадзянам у вырашэнні праблем.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Списки газет и журналов, издаваемых в г. Минске, районных газет в БССР на 1930 г. и 1931 г., сведения о штатах сектора печати Белорусского управления связи на 1 января 1931 г. (17 мая 1930 г. – 28 января 1931 г.) // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Ф. 4п. Оп. 1. Д. 5024.
2. *Дарашчонак П. Л.* Станаўленне раённых газет як масавай перыёдыкі / Рэгіянальная прэса: традыцыі, вопыт, перспектывы: матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 27 кастр. 2007 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2007. С. 31–33.
3. *Марцелев С. В.* Печать советской Белоруссии: ист. очерк. Минск: Беларусь, 1967. 510 с.
4. Проекты постановлений СНК БССР и ЦК КП(б)Б, докладные записки отдела пропаганды и агитации ЦК КП(б)Б, Белостокского и Вилейского обкомов КП(б)Б от 25 июля и 20 августа 1940 г., об упорядочении штатов и перестройке аппарата республиканских, областных и районных газет (29 сентября 1938 г. – 7 июля 1941 г.) // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Ф. 4п. Оп. 1. Д. 12920.